1. Журавлев, В. В. Особенности режиссуры оперного фестивального спектакля : На примере Зальцбургского фестиваля рубежа XX и XXI веков / В.В. Журавлев: автореф. дис… канд. искусств по специальности 17.00.01 – театральное искусство. – М., 2002 // Научная библиотека диссертаций и авторефератов disserCat [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.dissercat.com/content/osobennosti-rezhissury-opernogo-festivalnogo-spektaklya-na-primere-zaltsburgskogo-festivalya. –Дата доступа: 4.02.2018.

2. Salzburger Festspiele / Официальный сайт фестиваля [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.salzburgerfestspiele.at. – Дата доступа: 4.02.2018.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Лінькова Н.А.,** магістрант

Навуковы кіраўнік – Наркевіч Н.І.

## АДЛЮСТРАВАННЕ МАТЫВАЎ КОСМАСУ І СВЕТАБУДОВЫ Ў БЕЛАРУСКІМ НАРОДНЫМ АРНАМЕНЦЕ: КАНТЭКСТУАЛЬНЫ АНАЛІЗ

Праблема семантыкі беларускага народнага арнамента з‘яўляецца актуальнай ў цяперашні час, бо звязана яна з пытаннем асмыслення нацыянальных асаблівасцей беларускага мастацтва і патрэбай грамадства ў распрацоўке беларускага мастацкага стылю.

Арнаменту належыць падпарадкаваная роля, ён не з‘яўляецца самастойным творам мастацтва, ён упрыгожвае прадмет, робіць яго больш выразным, эмацыянальна багатым і эстэтычна значным. У народным побыце кожны выраб быў строга рэгламентаваны ў функцыянальным прызначэнні, таму і змест арнаменту, яго форма строга адпавядалі дадзеным крытэрыям.

Кожны арнаментальны матыў – гэта адлюстраванне тысячагадовай гісторыі чалавецтва. Арнамент можна ўбачыць на вырабах з рогу, косці,

каменю, кераміці, што адносяцца аж да жалезнага веку. Адны арнаментальныя матывы распаўсюджаны толькі ў некаторых раёнах рэспублікі, другія бытуюць паўсюдна. У беларускім арнаменце можна сустрэць матывы, характэрныя для ўсіх славянскіх народаў, большасць з іх з‘яўляюцца адлюстраваннем старажытнай мадэлі светабудовы. Атрыманы намі ў спадчыну ад продкаў, арнамент адлюстроўвае мастацкія прынцыпы розных стыляў [1, с. 17]. Арнамент як элемент мастацкага стылю сустракаецца ў беларускай архітэктуры і скульптуры, але найбольш поўна ён прадстаўлены ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве.

Вусная народная творчасць дапамагае расшыфраваць значэнне таго ці іншага арнаментальнага знака. Дзённнікавыя запісы гутарак з беларускімі сялянамі доктара мастацтвазнаўства М. С. Кацара, зробленныя ім у 1930-ыя гг., сведчаць аб тым, што ўзоры ўяўляюцца людзям своеасаблівымі, часам з пэўным сэнсам. Вучоныя лічаць, што гэтымі знакамі чалавек яшчэ ў старажытнасці «закадзіраваў» выявы нябесных свяціл [1, с. 19].

Вобразы космаса і светабудовы прыйшлі ў дэкаратыўнае мастацтва з міфалогіі. Свае веды пра свет чалавек абагульняў у выглядзе нейкага канкрэтнага вобраза, мадэлі, а пасля пераносіў іх у навакольнае асяродзе ў выглядзе сімвалаў, знакаў да якіх можна аднесці і арнамент. Міфалагічныя ўяўленні беларусаў заснаваны перш за ўсё на адзінстве Космасу ва ўсіх яго элементах. Кожная рэч, з‘ява разглядаецца і адлюстроўваецца графічна ў сваіх шматлікіх і часам вельмі нечаканых сувязях з першаэлементамі Космасу.

Элементам, які злучае хаос і парадак, матэрыяльны і духоўны пачатак з‘яўляецца ромб [1, с. 57]. Менавіта ромб у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве пакладзены ў аснову шматлікіх сімвалаў, якія выяўлялі жыватворны пачатак, ідэю з‘яўлення і аднаўлення жыцця. У беларусаў ромб, як графічная выява Зямлі выступае цэнтрам Космасу. Звычайна ромб з‘яўляўся стыржнем кампазіцыі, вакол якога групаваліся астатнія фігуры. Налічваецца вялікая колькасць варыянтаў узораў, у якіх ромбы, квадраты маюць ля вяршынь парасткі ў выглядзе кручкоў. Размешчаныя адзін у другім ромбы з маленькімі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ромбікамі ўнутры – матыў, які сустракаецца не толькі ў беларускім арнаменце, але і ў арнаменце народаў Усходу [1, с. 64].

Адным з самых галоўных сімвалаў касмічнай прасторы ў беларусаў з пакон вякоў і да нашых дзён з‘яўляецца Сонца. Археолагі і этнографы лічаць, што ромбы і рашэцістыя квадраты не што іншае, як выявы нябесных свяціл, у прыватнасці Сонца. Паказальна, што ткачыхі з Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці, з Капыльскага – Мінскай і іншых мясцін рэспублікі называюць падобныя матывы сонейка, круг. Справа ў тым, што выкладаннем немагчыма выткаць форму круга – замест яго атрымліваецца ромб. Цікава, што ў перабіраным ткацтве, якое дае магчымасць выткаць круг, майстрыцы па традыцыі працягваюць называць ромб кругам [1, с. 80]. У вышыўцы нашых продкаў-славян узор Сонца меў выгляд ромба з прамянямі, якія ад яго адыходзяць [2, с. 114]. Гэты матыў, вызначаецца вялікай разнастайнасцю: у адных выпадках у цэнтр ромба змяшчаецца крыжык, у другіх ромбік.

Аналогіі паміж сонцам і агнём падказвалі чалавеку сувязі паміж зямнымі і нябеснымі з‘явамі. У ткацтве і вышыўцы агонь паказваецца матывам, у аснове якога – васьміканцовая разетка-зорка. Ад яе адыходзяць моцна стылізаваныя ці досыць рэалістычныя раслінныя ўзоры [2, с. 122] .

У народным арнаменце беларусаў нямала ўзораў, формы якіх утвораны прамежкамі паміж дзвюма фігурамі. Пры гэтым канфігурацыя фонавых частак арнаментальнага знака звычайна адпавядае канфігурацыі самога ўзору, што адыгрывае важную ролю ў дэкоры. Параметры гэтых дэкаратыўных плямаў ніколі не бываюць выпадковымі, яны цесна звязаны з формай усяго ўзору. Пры гэтым узор і фон становяцца падчас выяўленча раўназначнымі і іх можна пераблытаць, прыняўшы за галоўны матыў прамежак паміж фігурамі [1, с. 94]. Добры прыклад таму матыў «Яднанне сонца і зямлі». У народнай свядомасці саюз зямлі і сонца спрадвеку звязваўся з жыццём, цяплом, ураджаем. Гэты жыццёвы працэс вельмі выразна выяўлены ў тканых і вышываных узорах. Майстрыхі ўкампанавалі адзін матыў у другі – атрымаўся ўзор, які сімвалізуе яднанне зямлі і сонца [2, с. 116].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз геаметрычнага арнаменту будзе не поўным, калі не спыніцца яшчэ на адным элеменце – матыве «Дрэва жыцця». Матыў Святога Дрэва нярэдкі ў дэкоры тканых і вышываных вырабаў. Вельмі часта гэты матыў выкарыстоўвалі і ў дэкоры слуцкіх паясоў [3, с. 127]. Прадрэва, або Касмічнае Дрэва, ў большасці індаеўрапейскіх народаў, якія жылі ў лесе, было цэнтрам, воссю свету. Яно злучала цэнтр Пекла, цэнтр Зямлі і цэнтр Неба. Па вертыкалі ў дрэве адрозніваюць тры часткі, па гарызанталі – чатыры (бо знаходзіцца яно пасярод свету, які разгортваецца ад дрэва ў чатыры бакі, у чатырох напрамках). Па вертыкалі дрэва мадэлюе асноўныя касмічныя зоны [3, с. 34]. Вобраз дрэва вызначаў для чалавека яго месца ў Космасе. Паступовa гэты вобраз стаў важнейшым сімвалам культуры.

Мадыфікацыяй дрэва (як і самаго чалавека, які стаіць з раскінутымі рукамі) з‘яўляецца крыж. Крыж увасабляе бачныя і нябачныя перакрыжаванні розных энергій, а таксама электрамагнітнага, гравітацыйнага, хранальнага палёў на зямной паверхні [3, с. 37]. Крыж – універсальны, шматзначны сімвал чалавецтва, знак, які сімвалізуе агонь, сонца, ратаванне, вечнае жыццё, ідэю бязмежнасці. [4, с. 128]. Крыж займаў значнае месца і ў геаметрычных узорах беларускай народнай вышыўкі: ён мог быць упісаны ў іншыя фігуры або складаць самастойны рапорт арнаментальнай кампазіцыі. У беларускім арнаменце існуе некалькі разнавіднасцей крыжападобных разетак: прамыя, касыя, складаныя, з элементамі прамога і касога крыжоў.

Побач з сімваламі зямлі і сонца ў дэкаратыўна прыкладным мастацтве стаіць узор месяца, які ў народным мастацкім ткацтве перадаецца ў выглядзе ромба або некалькіх ромбаў, устаўленых адзін у адзін. Бакі яго гладкія ці зубчастыя, калі складаецца з дробных квадрацікаў, але не маюць ніякіх адросткаў, як узор сонца [2, с. 118].

У беларускім арнаменце існуе яшчэ адзін цікавы матыў − «зорка». Матыў зорка мае мноства варыянтаў: простыя выцягнутыя, складаныя, контурныя, з парасткамі, зчэпленыя адна з адной. Зорка ў беларускім народным арнаменце часцей за ўсё мае 8 канцоў [1, с. 85]. Гэты арнаментальны матыў сустракаецца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкладаных тканінах, але адсутнічае ў шматнітовых. Найбольшую ж колькасць яго варыянтаў мы знаходзім ў перабіраных тканінах. Форма зоркі можа відазмяняцца за кошт парасткаў, якія адыхордзяць ад яе, кветак, бутонаў. Часам зорка з парасткамі нагадвае куст у квецені. Усё гэта сведчыць аб тым, што арнамент – не застылая форма. Ён пастаянна змяняўся, папаўняўся новымі элементамі, дэталямі, матывамі, у якіх адлюстравалася ўяўленне пра навакольны свет кожнага новага пакалення [1, с. 87].

Пра пераемнасць народных традыцый ў арнаменце сведчаць замалёўкі, зробленыя ў 1945 г. прафесарам М. Кацарам і архітэктарам М. Андросавым у разбураннным вайной Віцебску. У развалінах Святадухаўскай царквы яны знайшлі рэшткі сатлелай тканіны, узоры якой ідэнтычныя ўзорам сучасных народных вырабаў. Найбольш раннія ўзоры даследчыкі аднеслі да XIV ст., найбольш познія – да XX ст. [1, с. 29]. Вывучэнне мастацкай спадчыны народнага арнаменту ўскладняецца тым, што многія прадметы матэрыяльнай культуры загінулі ў агні шматлікіх войнаў, якія прайшліся па беларускай зямлі. Нельга не ўлічваць і аб‘ектыўныя працэссы, што адбываюцца ў грамадстве, калі старое саступае новаму і сапраўды мастацкія рэчы не заўсёды захоўваюцца.

Такім чынам, пры аналізе і вывучэнні народнага арнаменту важна высветліць – нараджэнню якіх арнаментальных формаў садзейнічала тэхналогія ткацтва, а якія маюць старадаўнюю знакавую сімволіку.

Адзначым, што у народным арнаменце, які сваімі эстэтычнымі сродкамі ўздзейнічае на чалавека, мадэлюе новую, вышэйшую рэальнасць, захоўваюцца ў зашыфраваным выглядзе шматлікія веды пра Космас і жыццё чалавека. Гэта наша культурная спадчына, неацэнны набытак мінулага і адначасова важная частка сучаснага культурнага працэсу, якая нясе магутны культурнатворчы патэнцыял, выпрацаваны і назапашаны за шматвяковы перыяд свайго бытавання.

---

1. Жабінская, М.П. Складзі ўзор сам = Составь узор сам: Нар. арнамент у побыце. – Мн.: Полымя, 1992. – 220 с.: іл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Кажухоўская, Л.С. Сімвалы гарманізацыі космасу беларусаў / Искусство и культура: научно-практический журнал // учредитель учреждение образования «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова». – 2014. – № 3. – С. 56-60.

3. Кацар, М.С. Беларускі арнамент: Ткацтва. Вышыўка ⁄ М. С. Кацар; пер. з рус., літ. апрац. і навук. рэд. Я. М. Сахуты. – Мінск: БелЭн, 1996. – С.17.

4. Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі (нарысы). – Мн. : Маст. літ., 2000. – 400 с.

**Ліпінская Н.С.,** студэнт
Навуковы кіраўнік – Аляхновіч А.М.

## АБ ДЭФІНІЦЫІ ПАНЯЦЦЯЎ “МАСТАЦКІ ВОБРАЗ” І “МАСТАЦКАЯ ВОБРАЗНАСЦЬ”

На наш погляд разгляд гэтага пытання неабходна ажыццявіць са значэння паняцця ―мастацкі вобраз”, паколькі ў літаратуры ён распрацаваны больш дакладна ў параўнанні з іншымі.

На думку рэжысёра П. А. Гуда – ―мастацкі вобраз – гэта асаблівы спосаб адлюстравання жыцця, характэрны толькі для мастацтва. Гэта рэчаіснасць перапрацаваная творчай фантазіяй мастака і ўвасобленая ў метафарычнай форме”.

Мастацкі вобраз нараджаецца ўяўленнем творцы пад уплывам моцна адчутага ўражання ці больш пільнага мастацкага бачання з‘яў жыцця і прыроды. Гэта ўласціва мастацкі адораным натурам, якія адчуваюць тое, што часам не даступна простаму позірку. Моцна адчутае і заўважанае мастак увасабляе ў ствараемым ім творы, у той ці іншай матэрыяльная форме (пластычнай, гукавай, жэста – мімічнай, моўнай) і пасля гэтае матэрыялізаванае мастацтвам пачуццё, узнаўляецца ва ўяўленні, успрымаючага яго, гледача,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ